**ВОДЗЫЎ АФІЦЫЙНАГА АПАНЕТА**

на дысертацыю Сямашка Надзеі Канстанцінаўнай
**"Беларускія і расійскія даследаванні агранай гісторыі Беларусі (канец XVIII ст. – 1850-я гг.)."**
прадстаўленнай на саіскание вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук,
па спецыяльнасці 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазанўства і метады гістарычнага даследавання

**Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасці і галіне навукі, па якіх яна прадстаўлена да абароны.**

Змест дысертацыйнага даследавання Сямашка Н.К. "Беларускія і расійскія даследаванні агранай гісторыі Беларусі (канец XVIII ст. – 1850-я гг.)" адпавядае спецыяльнасці 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання і галіне навукі – гістарычныя, а таксама сферы даследавання – развіццё гістарычнай думкі ў адпаведнасці з пашпартам спецыяльнасці, зацвержанага ВАК Рэспублікі Беларусь ( загад № 180 ад 01.06.2022).

**Актуальнасць тэмы дысертацыі.**

Аграрная гісторыя – гэта неад'емны складнік гісторыі дзяржавы і важны кампанент сучаснасці, які патрабуе аб'ектыўнага аналізу і асэнсавання. Сучасныя рэаліі айчыннай гістарычнай навукі дыктуюць патрэбу ў пошуку аб'ектыўных падыходаў і распрацоўкі новых тэорый і канцэпцый.

Аграрная гісторыя Беларусі традыцыйна з'яўляецца аб'ектам значнай увагі і навуковых пошукаў даследчыкаў. На сёняшні дзень ў сучаснай айчыннай гістрарычнай навуцы адсутнічае абагульняльная праца па гістрарыяграфіі аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг., што абумаўлівае яе тэарэтычную і практычную значнасць.

Праблема аграрных адносін доўгія часы з'яўлялася актуальнай, і сёння застаецца ў шэрагу дыскусійных пытанняў і адным з прыярытэтных напрамкаў гістарыяграфіі. Гістарыяграфічнае асэнсаванне развіцця сельскай гаспадаркі Беларусі перыяду зараджэння капіталізму дазваляе выявіць светапоглядныя ўяўленні навукоўцаў, тэарэтычныя пабудовы, а таксама скажэнні ў распрацоўцы гістарычных канцэпцый, выкліканыя суб'ектыўнымі фактарамі і аб'ектыўнымі перадумовамі развіцця гістарычнай думкі. Вывучэнне гістарыяграфіі аграрнай гісторыі дазваляе вызначыць спецыфіку даследаванняў ў галіне абранай тэмы. У адпаведнасці з запытам сучаснага

грамадства ў павышэнні якасці жыцця і пабудове эфектыўнай мадэлі сацыяльнага развіцця значная ўвага павінна надавацца даследаванням аграрнай гісторыі Беларусі, асабліва ў часы трансфармацыйных зрухаў.

Праблематыка беларускіх і расійскіх даследаванняй агранай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг. патрабуе ўзважвання гістарычных поглядаў, тэорый, канцэпцый і распрацоўкі абгрунтаванай гістарыяграфічнай канцэпцыі праблемы. Тым самым, перад намі своечасова узнімаецца актуальная навуковая праблема.

Улічваючы дасягненні гістарычнай навукі ў адзначанай галіне, магчыма будзе даследаваць перспектыўныя навуковыя кірункі, якія дазволяць разгледзець значэнне комплекснага падыходу да разгляду аграрнай гісторы ў вывучэнні сацыяльнай, дэмаграфічнай, эканамічнай гісторыі. Таму важна аб'ектыўна прааналізаваць гістарыяграфію гісторыі агранай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг.

**Ступень навізны вынікаў, якія атрыманы ў дысертацыі, і навуковых палажэнняў, якія выносяцца на абарону.**

У кандыдацкай дысертацыі Н.К. Сямашка "Беларускія і расійскія даследаванні агранай гісторыі Беларусі (канец XVIII ст. – 1850-я гг.)" упершыню выяўлены і праналізаваны канцэптуальныя падыходы, тэорыі, заканамернасці і тэндэнцыі па праблемах даследаванняў аграрнай гісторыі ў гістарыяграфіі канца XIX – пачатку XXI ст.

Новым у айчынай гістарыяграфіі з'яўляецца вызначэнне савецкімі гісторыкамі працэсу зараджэння элементаў капіталізма, як комплексаній праблемы, якая ўключала ў адінае цэлае сацыяльна-экнамічныя, класавыя і палітычныя аспекты. Да дасягенняў дысетрацыйнага даследавання неабходна аднесці погляд саіскальніка згодна з якім, характэрнай тэнэнцыяй у свекай гістарычнай наывуцы было атаясамліванне працэсаў разлажэння феадальна-прыгоніцкіх і зараджэння буржуазных адносін. Заслугоўвае асаблівай увагі вызначэнне навукоўцам ролі аграрнага сектара ў фарміраванні капіталістычных адносін.

У адпаведнасці з праблемна-храналагічным падыходам Н.К. Сямашка устаноўлена, што сучасныя гісторыкі ў недастатковай ступені пераасэнсоўваюць атрыманыя вынікі даследаванняў аграрнай гісторыі савецкага часу, падкрэсліваючы іх метадалагічную абмежавансць (пераблоьшванне ролі тэмпаў развіцця капіталізма ў беларускай вёсцы).

Упершыню у дысертацыйным даследаванні прапанавана перыядызацыя гістарыяграфіі аграрнай гісторыі канца XVIII ст. – 1850-х гг., вызначаны актуальныя праблемы, якія патрабуюць далейшага комплекснага

даследавання па праблемах аграрных адносін канца XVIII – першай паловы XIX ст.

У кандыдацкай дысертацыі саіскальнікам упершыню выяўлены метады, падыходы, тэндэнцыі і заканмернасці у расійскіх і беларускіх даследаваннях пры вызначэнні найбольш спрэчных пытанняў у галіне агранай гісторыі канца XVIII ст. – 1850-х гг.

**Абгрунтаванасць і дакладнасць вывадаў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі.**

Дысертацыйнае даследаванне з'яўляецца самастойна выкананай працай, лагічна сканструяваным, творчым даследаваннем. Дысертацыйнае даследаванне з'яўляецца самастойна выкананай працай. Саіскальнікам узнята важная навуковая праблема айчыннай гістарыяграфіі і прапанаваны падыход да яе вырашэння, які прадугледжвае аб'ектыўнае даследаванне існуючых уяўленняў на аснове гістарыяграфічнай рэфлексіі.

Для дасягнення мэты даследавання аўтар дысертацыі разглядае канструяванне адзінай гістарыяграфічнай канцэпцыі для вывучэння праблемы аграрнай гістрыі Беларусі перыяду распаду феадальных і зараджэння буржуазных адносін.

Абгрунтаванасць і верагоднасць вывадаў і палажэнняў, сфармуляваных у дысертацыі падмацаваны аналізам шырока кола гістарыяграфічных крыніц. На падставе гістарыягркафічнай рэфлексіі саіскальнікам сістэматызаваны і дакладна вызначаны супярэчлівыя працэсы развіцця поглядаў і тэорый па праблемам аграрнай гісторыі канца XVIII ст. – 1850-х гг. , што знайшло свае адлюстраванне у высновах і палажэннях дысертацыйнага даследавання.

**Навуковая, практычная, эканамічная і сацыяльная значнасць вынікаў дысертацыі з указаннем рэкамендацый па іх выкарыстанні.**

Навуковая значнасць вынікаў дысертацыі Сямашка Н.К. заключаецца ў тым, што яны дазваляюць канструктыўна ўзважваць разнастайныя погляды і ўяўленні навукоўцаў па праблеме развіцця аграрных адносін канца XVIII ст. – 1850-х гг.

Высновы, зробленыя дысертантам, актуалізуюць перспектывы даследавання такіх праблем як характар эканамічных узаемаадносін паміж горадам і вёскай, маёмасная і сацыяльная дыферынцыяцыя сялянства; характар прамысловага прадпрымальніцтва памешчыкаў і яго ўплыў на сацяльна-эканмічнае развіццё беларускай вёскі.

Практычная значнасць. Матэрыялы і высновы даследавання могуць быць выкарыстаны для падрыхтоўкі агульных і спецыяльных курсаў

гістарыяграфіі гісторыі Беларусі, гістарыяграфіі ўсходніх славян у вышэйшых навучальных установах; пры напісанні абагульняльных прац па гісторыі Беларусі. Асабліувую цікавасць дысертацыя ўяўляе ў распрацоўцы лекцый, семінарскіх заняткаў, вучэбна-метадычных комплексаў і можа выкарыстоўваццца пры напісанні даследчыцкіх работ студэнтамі і магістарнтамі.

Вынікі дысертацыйнага даследавання выкарыстоўваюцца у адукацыйным працэсе установы адуацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітеэт імя Максіма Таека" (акт аб укараненні № 04-23 ад 23.09.2014)

Эканамічная значнасць. Матэрыялы кандыдацкай дысертацыі Н.К. Сямашка могуць выкарыстоўвацаа для распрацоўкі і рэалізацыі навучальных праграм адукацыйных курсаў для забяспчэння пазабюджэтных сродкаў установамі адукацыі.

Сацыяльная значнасць. Гістарычная навука садзейнічае задавальнненю запыта грамадства ў трансляцыі ведаў, накіраванных на захаванне гістарычнай памяці і нацыянальнай самабытнасці. Дысетрацыйнае даследаванне актуалізуе неабходнасць выхавання павагі да папярэдніх пакаленняў гісторыкаў і сваіх сучаснікаў.

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі ў навуковым друку.** Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі адлюстраваны ў 6 навуковых артыкулах у выданнях, якія ўключаны ВАК Рэспублікі Беларусь у пералік навуковых выданняў для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў (2,3 аўт. л.), 7 публікацый – у навуковых зборніках (1,5 аўт. л.), 3 – у зборніках матэрыялаў канферэнцый (0,6 аўт. л.). Агульны аб'ём апублікаванных работ складае 4,4 аўт. л.

**Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК.** Афармленне дысертацыі адпавядае інструкцыі ВАК Рэспублікі Беларусь ад 28.02.2014.: прысутнічаюць усе неабходныя структурныя часткі; у дысертацыі ёсць спасылкі на аўтараў і крыніцы, якія былі выкарыстаны саіскальнікам, а таксама на ўласныя публікацыі, у якіх прадстааўлены асноўныя вынікі дысертацыйнага даследавання.

**Заўвагі па дысертацыі (пры іх наяўнасці), калі яны не ўказваюцца ў структурных элементах водгуку**

- Акрэсліваючы развіццё сучасных метадалагічных падыходаў, саіскальніца адзначае, што на падставе рэалізацыі мадэрнісцкай тэорыі гісторыкі прыйшлі да высновы аб перабольшванні тэмпаў развіцця генезісу ў

беларускай вёсцы (с. 7). Неабходна зазначыць, што дадзеныя высновы былі зроблены і ў дачыненні да характру функцыянавання і развіцця беларускіх гарадоў разглядаемага перыяду. Таму варта адзначыць і уплыў урбанізацыйных тэорый на развіццё метадалгічных уяўленняў сучасных гісторыкаў.

- Разглядаючы змест і структуру 1 главы, дысертанту варта было бы вылучыць групы выкарыстанных крыніц, што дазваляе ўлічваць інфармацыйныя магчымасці крыніц, на якія абапіраліся гісторыкі пры падрыхтоўцы імі прац. Так, напрыклад на с. 20 узгадваецца істотная гістарыяграфічная крыніца "Ежегодник по аграной истории Восточной Европы".

- Характарызуючы і ацэньваючы гістарыяграфію праблемы у 1 главе, пажадана таксама звярнуць увагу на магчымасць выкарыстання спасылак на гістарыяграфічныя працы і абагульняльныя даследаванні расійскіх гісторыкаў.

- У канцэпцыі даследавання зазначаецца, што гістарыяграфічная думка з пачатку 90-х гадоў ХХ ст. марудна пераасэнсоўвае назапашаныя веды і нязначная колькасць навукоўцаў па новаму аналізуюць савецкія працы (с. 40). Савецкая гістарыяграфія адзін з самых працяглых адрэзкаў развіцця гістарычнай думкі, які мае адметныя і ўласцівыя характырыстыкі, што ў сваю чаргу аказала істотны ўплый на развіццё дыскусійных канцэпцый і зараз.

- Акцэнтуючы ўвагу на характарыстыцы даследаванняў пачатку ХХ ст., саіскальніца адзначае што ў гэты час адбываецца фарміраванне нацыянальна-гістарычнай ідэі (С. 40; С 49–50). Мэтазгодна таксама звярнуць увагу на вызначэнне ролі дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі ў фармірванні і развіцці нацыянальнай ідэі. Абгрунтаванне пытанняў пошуку шляхоў зараджэння нацыянальнай ідэі мае выключна важнае значэнне для захавання гістарычнай памяці і разумення сутнасці нацыянальна-дзяржаўнай ідэнтынасці.

- У 3 главе саіскальніцай надаецца значная ўвага аналізу прац В.У. Чапко, у прыватнасці манаграфіі, прысвечаннай развіццю гарадоў (с.73–76). Вывучэнне пытанняў феадалізацыі грамадства і вызначэння месца гарадоў у дадзеным працэсе, на раду з роляй вёскі, дае больш поўныя ўяленні аб зараджэнні элементаў капіталізму.

Аднак выказаныя заўвагі не зніжаюць навуковую вартасць праведзеннага даследавання, носяць рэкамендацыйны і дыскусійны характар.

**Адпаведнасць (неадпаведнасць) навуковай кваліфікацыі суіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе.**

Дысертацыйнае даследаванне Н.К. Сямашка – самастойна выкананая кваліфікацыйная навуковая работа, якая мае ўнутранае адзінства і сведчыць аб асабістым укладзе навукоўца ў распрацоўку навуоквай праблемы гістарыяграфіі аграрных адносін. Навкуовая кваліфікацыя Н.К. Сямашка адпавядае вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання.

Дысертацыйнае даследаванне “Беларускія і расійскія даследаванні агранай гісторыі Беларусі (канец XVIII ст. – 1850-я гг.).” адпавядае патрабаванням “Положения о присуждении ученых степеней и присвоении ученых званий в Республике Беларусь», а яго аўтар – Сямашака Надзея Канстанцінаўна – заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата гістарычных навук за:

- вызначэнне тэндэнцый і заканамернпсцяў у развіцці гістарычнай навукі па апрблемах даследавання агранай гісторыі канца XVIII ст. – 1850-х гг;
- распрацоўку і абгрунтаванне перыядызацыі праблем гістарыяграфіі агранай гісторыі канца XVIII ст. – 1850-х гг. з улікам сучасных метадалагічных падыходаў;
- вызначэнне ролі, хараактару, накірункаў даследаванняў дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі ў вывучэнні праблем агрананй гісторыі;
- выяўленне ўнёску савецкіх гісторыкаў у даследаванні пытанняў распаду феадальна-прыгоніцкай сістэмы, развіцця таварна-гаршовых адносін, сацыяльнай дыференцыяцыі сялянства, першапачатковых форм назапашвання капіталу і вызначэнне ўплыву савецкай гістарычнай навукі на развіццё далейшых навуковых даследаванняў;
- гістарыяграфічны аналіз даследаванняў, падыходаў, тэорый і канцэпцый па праблемах агранай гісторыі ў сучаснай гістарычнай навуцы Беларусі.

Афіцыйны апнент,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
загадчык кафедры сацяльнай работы
установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка” Ю.У. Врублеўскі
09.12.2024